Я здароў і адчуваюся добра. Шчыра Вам, любыя, дзякую за сёньнешнюю перадачу.

Твайго ліста я не атрымаў. Думаю, хутка ўбачымся.

Ваш *Адам*.

## № 45. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*Вологда, 6/VI–31 г.*

Дарагая любая мая Анечка!

Я в дороге. Из Москвы выехали 30 мая. 31 мая прывезьли нас у Вологду и высадили. Тут мы прабываем да 7 июня. Заўтра нас адправляют у Вятку. Приедем туда 8. А там уже недалеко и да места высылки: 33 километра да гор. Слободского. Мы асуджаны на выгнаньне на 5 год, лічачы тэрмін ад дня арэста. Як прыеду на месца, дам тэлеграму і прышлю падрабязны ліст аб гэтым месцы. Я здароў. Разам са мною ў адно месца едуць Алесь Аніхоўскі, Міх[ась] Маркев[іч] і Ген[адзь] Багдановіч. Любая Анечка і слаўныя мае дзетанькі, ня сумуйце па сваім татачку. Прыдзе час, і ён зноў вернецца да вас, і мы будзем разам. Сэрцам і душою я з Вамі нязьменна. Как вы жывяце? Ці здаровы вы ? Ці атрымала ты лісты, што пасылаў я з Бутырак? Кали думаеш написать до получения *[1 слова нрзб.]* письма, то пиши по адрэсу: гор. Слободской, до востребования мне. Гроши ў мяне яшчэ ёсьць. Не беспокойтеся и не тужите.

Крепко–крепко целую вас —

ваш *Адам*.

## № 46. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*28/VI–31. Вятка.*

Дарагая, любая мая Анечка!

Слаўныя мае любяняткі, Лорачка і Лялячка! Ня ведаю, ці дайшлі мае лісты да Вас. Я пісаў ужо, што мы яшчэ ўсё ў Вятцы сядзімо. Дагэтуль яшчэ нас трымаюць у Дом зак’е. Што за прычыны — невядома. Дакуль пратрымаюць — таксама нічога невядома. Нас выклікалі ў ДПУ мясцовае, там мы запоўнілі анкеты, далі падпіскі аб нявыездзе з Слабадзкога, сфотографа[ва]лі нас. Пыталі мы, калі нас адправяць на месца, адказалі: „скора“, і гэтае „скора“ цягнецца от ужо тры тыдні. Хочацца думаць, што ўсё–ж урэшце калі–небудзь ды адправяць. Я здароў, настроем бадзёры. Жыву з Алесем на ягоных запасах. Думаем, што яшчэ з месяц працягнем на гэтым. Грошы, што былі ў мяне, у Вологдзе ўзялі на захаваньне і хаваюць іх да гэтай пары. Усё яшчэ не прыслалі, а выправілі — ня выдаўшы. Але павінны, кажуць, прыслаць. Як жывяце Вы, ці жывы і здаровы? Ці паехалі дзеці на вёску з бабуляй? Як маецца Ігнась? Калі атрымаеш гэту лістоўку, адпішы лістоўкай–жа на адрас вятского дома заключэньня (камэра № 12 новага корпуса). Ці кончыліся ўжо заняткі ў школе і ці маеш ты одпуск? Чакаю, што ўсё–ж скора мо адправяць на месца, тады напішу вялікі ліст. У Вятку прыехалі Н. Чарнушэвіч і М. Гарэцкі, іх узялі ў ДПУ, а там ці выпусьцілі ўсіх, ня ведаем. Моцна цалую Вас, любыя мае. Вітай старых і Алесеву Ганну.

Ваш *Адам*.